УДК 811.161.3

**В. М. Сімановіч**
(Мінск, Беларусь)

# ПРЫНАЗОЎНІКАВЫЯ КАНСТРУКЦЫІ Ў СІСТЭМЕ БЕЛАРУСКІХ ПРЭСОНІМАЎ

*Артыкул прысвечаны аналізу назваў перыядычных выданняў, адным са структурных кампанентаў якіх з'яўляецца прыназоўнік. Названыя канструкцыі складаюць невялікую групу прэсонімаў. Былі прааналізаваны функцыі прыназоўнікаў* ***да****,* ***з****,* ***за****,* ***на****,* ***над****,* ***пад****,* ***у****, а таксама структурна-граматычныя мадэлі ўтварэння прэсонімаў з прыназоўнікамі. Абгрунтавана выснова, што значная частка беларускіх прыназоўнікавых прэсонімаў – канструкцыі з прыназоўнікам* ***за****. У сваю чаргу выкарыстанне прыназоўнікаў* ***на*** *і* ***пад*** *абмежавана толькі некалькімі асобнымі назвамі перыядычных выданняў*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Назвы перыядычных выданняў (прэсонімы) складаюць разгалінаваную сістэму, адзінкі якой адрозніваюцца паміж сабой структурна-граматычнымі і семантычнымі адносінамі.

Паводле марфалагічных характарыстык усю сукупнасць назваў газет і часопісаў можна падзяліць на дзве асноўныя групы: з прыназоўнікамі і без іх.

Прыназоўнікавыя канструкцыі ў сістэме беларускай прэсаніміі складаюць адносна невялікую групу назваў перыядычных выданняў – каля 10% ад агульнай колькасці найменняў газет і часопісаў

Дадатковыя структурныя элементы ў такіх канструкцыях канкрэтызуюць значэнне асноўных кампанентаў і могуць выражаць разнастайныя адносіны паміж імі.

Па сваіх семантычных і структурна-граматычных асаблівасцях прэсонімы з прыназоўнікамі вызначаюцца шматлікасцю ўтваральных мадэлей, а таксама разнастайнасцю функцый прыназоўнікаў.

Так, прыназоўнік **да** ў структуры прэсонімаў паказвае на тое, да чаго заклікаюць або “на з’яву, падзею, дасягненне якіх складае змест дзеяння, што выступаюць у якасці мэты дзеяння” [1, с. 152]. Прэсонімы з прыназоўнікам **да** належаць да монакампанентных або бікампанентных адзінак і прадстаўлены наступнымі ўтваральнымі мадэлямі: “**pr+Sub**$_{\text{Р.скл}}$”: *Да злучэння, Да працы*; **“Adv+pr+Sub**$_{\text{Р.скл}}$**”**: *Уперад да камунізма*, **“Sub**$_{\text{Н.скл}}$**+pr+Sub**$_{\text{Р.скл}}$**”**: *Шлях да камунізма*; **“pr+Adj+Sub**$_{\text{Р.скл}}$**”**: *Да новых перамог.*

Прыназоўнік **з** у сістэме прэсонімаў паказвае “на прадмет, прастору і г. д., знутры або з межаў якіх накіраваны рух, дзеянне” [1, с. 136]. Асноўная частка адзінак названай групы належаць да бікампанентнай мадэлі **“Sub**$_{\text{Н.скл}}$**+pr+Sub**$_{\text{Р.скл}}$**”**: *Голас з Ліды, Голас з-пад Нёмана*, аднак адзначаюцца і асобныя полікампанентныя прэсонімы, утвораныя па мадэлі **“(Adj+Sub**$_{\text{Н.скл}}$**+pr+Sub**$_{\text{Р.скл}}$**”**: *Беларускі друк з самалёта*.

Асноўная частка аналізуемых перыядычных выданняў утрымлівае ў сваёй структуры праназоўнік **за**, што звязана з яго функцыямі. Прыназоўнік **за** выкарыстоўваецца пры ўказанні на асобу, справу і г. д., з мэтай забеспячэння (захавання) дабрабыту якіх ажыццяўляецца дзеянне. Найбольшай актыўна прэсонімы-дырэктывы з прыназоўнікам **за** канструяваліся ў 1930-я гады, што было абумоўлена імклівым ростам палітызацыі грамадства.

Монакампанентныя адзінкі з прыназоўнікам **за** прадстаўлены намінацыйнай мадэллю “**pr+Sub**$_{\text{Н.скл}}$”: *За абарону, За вучобу, За калектыў, За камунізм, За лес, За перамогу, За цэмент, За энергію* і г. д. Адзінкі, якія належаць да двухкампанентнай канструкцыі **“pr+Sub+Sub”**, утвараюцца па дзвюх асноўных намінацыйных мадэлях: **“pr+Sub**$_{\text{В.скл}}$**+Sub**$_{\text{Т.скл}}$**”**: *За ўладанне тэхнікай*; **“pr+Sub**$_{\text{В.скл}}$**+Sub**$_{\text{Р.скл}}$**”**: *За перамогу камунізма, За развіццё ільну, За сцяг першынства.* Вялікай колькасцю адзінак прадстаўлена мадэль **“pr+Adj+Sub**$_{\text{В.скл}}$**”**: *За бальшавіцкае мастацтва, За бальшавіцкі саўгас, За бальшавіцкую гісторыю, За высокі ўраджай, За высокую якасць, За газетныя кадры, За крэпасць С.П.А.*, За *культурную дарогу, За ленінскае выхаванне, За народную ўладу* і г. д.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

У структуры прэсонімаў часам сустракаюцца і злучнікі; утвараюцца такія адзінкі па мадэлі “$pr+Sub_{В.скл}+con+Sub_{В.скл}$”: *За матор і дарогу, За тэмпы і якасць, За шасэ і матор, За якасць і тэмпы.*

Значная колькасць прэсонімаў з прыназоўнікам **за** належыць да полікампанентных назваў. Тут вылучаюцца трохкампанентныя найменні, утвораныя па наступных намінацыйных мадэлях: “$pr+Adj+(Sub_{В.скл}+Sub_{Р.скл})$”: *За бальшавіцкія тэмпы свінагадоўлі, За ўдарныя тэмпы ўборкі*; “$pr+Sub_{В.скл}+(Adj+Sub_{Р.скл})$”: *За гонар фабрычнай маркі*; “$Sub_{Н.скл}+(pr+Adj+Sub_{В.скл})$”: *Варашылавец за суцэльную тэхпісьменнасць*; “$pr+Adj+(Adj+Sub_{В.скл})$”: *За культурны савецкі гандаль, За савецкі культурны гандаль.* У сістэме беларускіх прэсонімаў прадстаўлены асобныя чатырохкампанентныя адзінкі з прыназоўнікам **за,** якія па сваёй структуры нагадваюць трохкампанентныя ўтварэнні, аднак па сэнсава-граматычных асаблівасцях з’яўляюцца эліптызаванымі, няпоўнымі найменнямі: *За аздараўленне працы і [*аздараўленне] побыту, За своечасовы [*рамонт] і якасны рамонт.*

У назвах перыядычных выданняў прыназоўнік **на** ўжываецца пры ўказанні на палажэнне, стан, у якім што-небудзь знаходзіцца ці прыводзіцца [1, с. 196]. Адзначаюцца розныя структурна-граматычныя мадэлі з названым прыназоўнікам у прэ- або інтэрпазіцыі. Асноўная частка прэсонімаў з прыназоўнікам **на** адносіцца да бікампанентных назваў, якія ўтвараецца па наступных мадэлях: “$pr+Sub_{М.скл}+Sub_{Р.скл}$”: *На ахове граніцы, На варце Кастрычніка, На варце краіны, На варце СССР*; “$Sub_{Н.скл}+pr+Sub_{М.скл}$”: *Аршанцы на варце, Беларусь на варце, ВСНГБ на чыстцы, Камсамолія на варце, Ударнік на варце*; “$Ver+pr+Sub_{М.скл}$”: *Будзь на варце.* Некаторыя назвы належаць да монампанентнай утваральнай мадэлі “$pr+Sub_{М.скл}$”: *На варце, На ўздыме.*

Часта прыназоўнік **на** ўказвае “на месца, мясцовасць, у межах якіх што-небудзь адбываецца, знаходзіцца” [1, с. 196]. Тут можна вылучыць монакампанентную мадэль “$pr+Sub_{М.скл}$”: *На чужыне*, а таксама двухкампанентную намінацыйную мадэль “$Sub_{Н.скл}+pr+Sub_{М.скл}$”: *Звязда на рубяжы, Камсамолец на маўнерах, Праўда на рубяжы* і г. д.

Прыназоўнік **на** можа ўжывацца і пры ўказанні “на дзейнасць, з’яву, якія выступаюць у якасці мэты дзеяння” [1, с. 199]. Адзначаецца бікампанентная намінацыйная мадэль “$pr+Sub_{В.скл}+Sub_{Р.скл}$”: *На абарону СССР, На штурм бездарожжа*, і трохкампанентная мадэль утварэння “$pr+Sub_{В.скл}+(Sub_{Р.скл}+Sub_{Р.скл})$”: *На штурм прарыву маслазагатовак.*

Зрэдку прыназоўнік **на** выкарыстоўваецца для ўказання на чалавека, прадмет, на якія накіравана дзеянне [1, с. 200]: *На акупанта!, На змену* (мадэль “$pr+Sub_{В.скл}$”).

Прыназоўнік **над** у сістэме прэсонімаў паказвае на асобу, прадмет, месца і г. д., вышэй за якія знаходзіцца пэўная прыродная з’ява [1, с. 202]. Адзінкі названай падгрупы ўтварыліся па бікампанентнай мадэлі “$Sub_{Н.скл}+pr+Sub_{М.скл}$”: *Зара над Друццю, Зара над Сожам, Святло над Нёманам* і г. д.

Нешматлікай з’яўляецца група прэсонімаў у структуры з прыназоўнікам **пад**, што ў складзе прэсонімаў паказвае на асобу, падзею, ідэю і г. д., якія вызначаюць характар, змест дзеяння, працэсу [1, с. 266]. Намі была выдзелена бікампанентная



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

мадэль утварэння прэсонімаў з названым прыназоўнікам **“pr+Adj+Sub**$_{\text{М.скл}}$**”**: *Пад ленінскім сцягам*.

Разнастайныя функцыі выконвае прыназоўнік **у**. Ён паказвае на прастору, межы, унутры якіх хто- або што-небудзь знаходзіцца, нешта адбываецца [1, с. 41]. Фіксуецца бікампанентная мадэль **“Sub**$_{\text{Н.скл}}$**+pr+Sub**$_{\text{М.скл}}$**”**: *Змена ў баю*, *Кіраванне ў адукацыі* і г. д. Выкарыстанне прыназоўніка **у** пры ўказанні на сукупнасць людзей, на якіх накіравана дзеянне, абмежавана бікампанентнай мадэллю ўтварэння **“Sub**$_{\text{Н.скл}}$**+pr+Sub**$_{\text{В.скл}}$**”**: *Друк у масы*, *Тэхніка ў масы*. Больш разнастайным у структурна-граматычным плане з’яўляецца выкарыстанне прыназоўніка **у**, які паказвае “на мэту, дзеля якой ажыццяўляецца дзеянне” [1, с. 43]. Адзінкі названай групы належаць да бікампанентнай мадэлі **“pr+Sub**$_{\text{В.скл}}$**+Sub**$_{\text{Д.скл}}$**”**: *У дапамогу настаўніку*, *У дапамогу самаадукацыі*, а таксама да чатырохкампанентных мадэляў утварэння **“pr+Sub**$_{\text{В.скл.}}$**+(Sub**$_{\text{Д.скл.}}$**+(Adj**$_{\text{Р.скл.}}$**+ Sub**$_{\text{Р.скл.}}$**))”**: *У дапамогу работнікам мясцовага друку*; **“(Adj**$_{\text{Н.скл.}}$**+ Sub**$_{\text{Н.скл.}}$**)+(pr+ Sub**$_{\text{В.скл.}}$**+ Sub**$_{\text{Д.скл.}}$**)”**: *Метадычны лісток у дапамогу школе*.

Часам сустракаюцца прэсонімы, якія ўтрымліваюць у сваёй структуры два прыназоўнікі. Звычайна такія назвы газет і часопісаў утвараюцца па бікампанентнай намінацыйнай мадэлі **“pr+ Sub**$_{\text{В.скл.}}$**+pr+ Sub**$_{\text{В.скл.}}$**”**, дзе ў прэпазіцыі выкарыстоўваецца прыназоўнік **у**, а ў інтэрпазіцыі прыназоўнік **за**: *У бой за пашу*, *У бой за прамфінплан*, У *паход за скурсырэц* і г. д.

Такім чынам, прэсонімы з прыназоўнікам у структуры складаюць адносна невялікую, але адметную групу назваў перыядычных выданняў. Частотнасць выкарыстання розных прыназоўнікаў і іх функцыянальная нагрузка ў найменнях моцна адрозніваецца. Значная частка беларускіх прыназоўнікавых прэсонімаў – гэта канструкцыі з прыназоўнікам **за**, што звязана з агульнай лозунгавасцю савецкай рыторыкі. У сваю чаргу выкарыстанне прыназоўнікаў **на** і **пад** абмежавана толькі некалькімі асобнымі назвамі перыядычных выданняў.

**Спіс літаратуры**

1. Объяснительный словарь русского языка / Государственный институт русского языка им. А. С. Пушкина. – 2-е изд., испр. – Москва : Астрель, 2003. – 421 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова